This article is distributed under the terms of the Creative Commons Attribution 3.0 PL
© Copyright by Uniwersytet Warszawski Katedra Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej & individual articles to their Authors

doi: 10.32612/uw.2543618X.2023.pp.143-160

Przegląd Środkowo-Wschodni, 8, 2023
ISSN 2543-618X eISSN 2545-1324

Nr art. 20230806

Data przesłania: 20.03.2023
Data akceptacji: 24.04.2023

**Вячаслаў Швед**
Uniwersytet Warszawski
v.shved@uw.edu.pl
https://orcid.org/0000-0002-2878-6231

# Умовы фарміравання ідэнтычнасці беларусаў (1795 – 1991 гг.) – спроба пастаноўкі праблемы

**Uwarunkowania kształtowania się tożsamości Białorusinów (1795–1991) – próba zarysu problemu**

Autor analizuje główne procesy życia społecznego i politycznego, które pozytywnie lub negatywnie wpłynęły na kształtowanie się tożsamości Białorusinów w różnych okresach historii kraju: polonizację i litwinizm końca XVIII-pierwszej połowy XIX wieku, rusyfikację po powstaniu 1830–31, rosyjskość zachodnia w połowie XIX w., białorutenizacja w latach 1923–27, sowietyzacja ludności białoruskiej w latach 1922–91. Autor zwraca uwagę na znaczenie każdego z wymienionych procesów dla kształtowania tożsamości Białorusinów.

Słowa kluczowe: polonizacja, litewskość, rusyfikacja, zachodniorusizm, białoruskość, sowietyzacja

Разбор працэсаў грамадска-палітычнага жыцця ў даследуемы перыяд пачнем, як не дзіўна, з **паланізацыі**[1], якая ахапіла Беларусь у час праўлення Паўла І і Аляксандра І (1796–1825 гг.). Пад „паланізацыяй" мы разумеем сістэму мерапрыемстваў дзяржаўных органаў, установаў культуры і адукацыі, Каталіцкай царквы накіра-

[1] „паланізацыі ў імя расійскага цара", як слушна напісаў у сваёй манаграфіі З. Шыбека . Гл.: *Historia Białorusi 1795–2000.* – Lublin: Instytut EŚW, 2002, s. 37.

ваных на асіміляцыю беларускага народа. „Под Русским владычеством полонизм развился в Русской земле гораздо сильнее, нежели во времена продолжительного господства над нею Речи Посполитой”, – пісаў даследчык С. Шалковіч[2]. Шляхта з Беларусі ў адрасе, па дадзеным Паўлу I, заявіла, што „жывучы не ў Польшчы, яна адчувае сябе як бы ў Польшчы і нават лепш, чым ў сапраўднай Польшчы”[3].

Аб ролі адукацыі ў захаванні польскасці добра гаварылася ў дакуменце „Будзем вучыцца”, які распаўсюджваўся ў першай палове XIX ст. на землях Беларусі:

> З адукацыі, кіруемай ворагам і схіляемай да выключнай яго выгодзе, можна атрымаць выгоду і для Польшчы. Калі са школ, якія стаяць пад пруска-аўстрыйска-маскоўскім папячыцельствам, могуць выходзіць польскія пісьменнікі, дык чаму ж з тых самых школ не могуць выходзіць і польскія грамадзяне? Мы не гаворым аб вялікіх вучоных, аб геніях, аб Каперніках; дарэмна мы выглядалі бы іх; каб дачакацца такіх пладоў, трэба каб народная ніва была спачатку добра апрацавана па-польску. Але мы цалкам маем права патрабаваць ад польскіх юнакоў, якія вучацца ў нямецка-маскоўскіх школах, каб яны былі грамадзянамі, а маючы гэта права, маем і абавязак, калі не падаць, дык хаця б напомніць ім спосаб, наслядуючы які яны не будуць ні немцамі, ні рускімі[4].

24 студзеня 1803 г. Аляксандр I падпісаў указ аб усталяванні навучальных акруг у Расійскай імперыі. Была створана і Віленская навучальная акруга на чале з апекуном князем Адамам Чартарыйскім (5 лютага 1803 – 17 красавіка 1824). Яна ахапіла ўсю тэрыторыю былога Вялікага княства Літоўскага з насельніцтвам у 11 млн.

---

[2] С. Шолкович, *Польская пропоганда в учебных заведениях Северо-Западного края. Сборник статей, разъясняющих польское дело по отношению к Западной России,* сост. Шолкович, Вып. 1, Вильна 1885, с. 242.

[3] Цыт. па: М.К. Любавский, *Основные моменты истории Белоруссии*, Москва 1918, с. 21.

[4] В. Ратч, *Польская эміграція до і во время последнего мятежа 1831–1863 гг.*, Вільна 1866, с. 406–407.

чал. і разглядалася ў палітычным значэнні, як „аб'яднанне края, якое цяпер выяўляецца ў адзінстве адукацыі”[5]. Даследчык М. Кукель пісаў:

> Вялікая навуковая, педагагічная, адміністрацыйная і кіруючая праца, звязаная з гэтым польскім культурным самаўпраўленнем на гэтых землях была прасякнута духам даўняй Адукацыйнай камісіі, грамадзянскім і патрыятычным імкненнем, як у міцкевічаўскай песні філарэтаў, праз навуку і годнасць да адраджэння Айчыны[6].

Быў адчынены Віленскі ўніверсітэт, які палякі сустрэлі вельмі радасна і ён сапраўды стаў „ачагом польскай адукацыі і вартаўніком нацыянальнага духа”[7]. Сродкамі паланізацыі ў Віленскім універсітэце і школах, падпарадкаваных яму, былі педагагічныя кадры, мова навучання, праграмы, вывучаемыя прадметы, падручнікі, літаратура ў бібліятэках[8]. Трэба прызнаць, што польская школа не толькі паланізавала беларускую моладзь, але і ўзмацняла пачуццё краёвага патрыятызма, абуджала цікавасць да гісторыі і культуры беларускага народу.

У перыяд 1772–1863 гг. сярод мясцовых інтэлектуальных эліт каталіцкага веравызнання на тэрыторыі Беларусі распаўсюджылася **ліцвінская** палітычная свядомасць. Успомнім філаматаў, філарэтаў і іншых чальцоў патаемных і легальных таварystваў 1-й чвэрці XIX на тэрыторыі Віленскай навучальнай акругі[9]. У 1850-я гады сфарміравалася так званая „літоўская партыя” (ці грамадска-літаратурны гурток) А.-Г.Кіркора. Характарыстыку гэтага цэнтра інт-

[5] St. Pigoń, *Księcia kuratora Adama Czartoryskiego troski o język i literatura polska*, „Źródła mocy” 1931, z. 7, s. 132.

[6] M. Kukieł, *Dzieje Polski porozbiorowej 1795–1921*. Wyd. 4. Paris, 1984, s. 191.

[7] В. Грабенский, *.История польского народа*, СПб. 1910, с. 417.

[8] Падрабязней пра гэта чытай маю кнігу – В.В. Швед, *Паміж Польшчай і Расіяй: Грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772–1863)*. Гродна, 2001, с. 209–211.

[9] Падрабязнасці гл.: W. Szwed, *Przejawy licwinskosci w zyciu spoleczno-poltycznym na ziemiach Bialorusi (pierwsza polowa XIX wieku),* „Rocznik centrum studiów białoruskich” 2016, nr 1, s. 45–61.

электуальнага жыцця далі даследчыкі А.Цвікевіч і М.Каяловіч. Першы пісаў, што яны „хоць і лічылі сябе палякамі, былі польскай культуры і бачылі будучыню краю ў сувязі з адроджанай Польшчай, але нацыянальна ці, лепш сказаць, этнаграфічна адрознівалі сябе і ад Варшавы і ад усяго карэнна польскага”, „людзі гэтыя жылі ўспамінамі аб Літоўскім княстве, аб гістарычнай асобнасці краю”, „цесна былі звязаны з вуніяй і са ўсёй тэй беларускай стыхіяй, якая ў ёй захоўвалася праз вякі”[10] .

Каяловіч пісаў:

Паводле іх пераконаньня, народу беларускаму пагражае тая самая небясьпека, як і народу польскаму, ад няспраўядлівых дамаганьняў на верхавенства (преобладание) расійскай нацыянальнасьці. Яны цьвердзяць, быццам беларусы ніколі ня былі дый ня хочуць быць расійцамі і ў той жа час яны адмаўляюцца ад намеру апалячваць беларуса. Паводле іх слоў, гісторыя вырабіла для беларусаў асобную нацыянальнасьць і вярнула ім тую самую веру, якая існавала да падзелу цэркваў пад вярхоўным адзінствам рымскага папы: захаваньне ў чыстасьці і недатыкальнасьці гэтае нацыянальнасьці і гэтае веры стварае сьвяты абавязак польскага народу. Яны кажуць, што кожны з гэтых народаў (беларусы і палякі) валодае ўсімі ўмовамі для самастойнага і сваяадменнага развіцця і мае на гэтае поўнае права, якое, на няшчасце, яшчэ не ўвайшло ў свядомасць народных мас (...) Яны хочуць усіх пераканаць, у тым ліку і саміх сябе, што ў літоўска-беларускіх правінцыях дваранства ня хоча і ня мае патрэбы абяртацца ў польскае, што яно прыняло мову і цывілізацыю польскую толькі часова, для развіцця ўласных (г. зн. беларускай мовы і цывілізацыі), і што нават сваё чыстае каталіцтва яно заменіць вуніяй, калі народ вызначае яе сваёй пануючай верай”[11].

Большасць пачынальнікаў беларускага культурнага адраджэння, не называлі сябе беларусамі, бо, як слушна піша сучасны польскі

[10] А. Цьвікевіч, *„Западно-руссизм”: Нарысы з гісторыі грамадскай мыслі на Беларусі ў XIX пачатку XX ст.* 2-е выд., Мінск 1993, с. 104, 106, 147.

[11] Цыт. па: А. Цьвікевіч, *„Западно-руссизм..,* с. 156–157.

даследчык Б. Бялаказовіч „не ўсвядамлялі сабе, хто яны па нацыянальнасці, і зусім лёгка зжываліся з тэрмінам „ліцвін". Тым часам сённяшні даследчык Р. Радзік піша:

> Ліцвінамі сябе лічылі тыя, хто вёў сябе з грамадзянства Вялікага княства Літоўскага, без погляду на этнічна-культурныя падзелы. Літоўскай была шляхта, якая выводзіла сябе як з этнічна літоўскіх родаў, так і з беларускіх, якая ў сваю чаргу ўсіх сваіх сялян, нягледзячы на іх мову і вызнанне, лічыла ліцвінамі. Літоўскасць азначала родавае паходжанне, сувязь з краем, яго грамадскасцю, гісторыяй, прыродай, лакальнымі супольнасцямі[12].

Шляхецкая эліта называла сябе «gente Lithuani (Rutheni), natione Poloni» (або пішуць яшчэ так: «gente Lithuanus (Ruthenus), nationae Polonus» – палякамі ліцвінскага або русінскага паходжання, а інакш па паходжанню ліцвін (беларус), па нацыянальнасці паляк[13]. „Ліцвін (русін), – піша ў сваёй другой працы Р. Радзік, – адначасова адчуваў сябе палякам – падобна таму, як цяпер брэтонец з'яўляецца французам. Палітычна-тэрытарыяльная „літоўскасць" была ў паўсядзённым жыцці бліжэй мясцовай эліце (азначала іх будзённае акружэнне), чым ідэалагічная „польскасць", якая абуджалася значна радзей"[14].

Ліцвінамі сябе лічылі А. Міцкевіч, А.Т. Касцюшка, бацька А. Чартарыйскага, прафесар ксёндз Ст. Юндзіл, біскуп Смаленскі і Луцкі, паэт і гіторык А.Нарушэвіч, гісторык І.Лялевель, кампазітар С. Манюшка, літаратар Л. Сыракомля і шмат іншых вядомых людзей, якіх адносяць да польскай культуры. Прыкладам праяўлення ліцвінскай самасвядомасці можа быць выпадак з Адамам Кіркорам.

---

[12] B. Białakozowicz, *U źródeł kształtowania się nowożytnie białoruskiej świadomości narodowej,* „Białoruskie Zeszyty Historyczne" 1995, nr 2, s. 51–52.

[13] А. Ліс, *Беларуская ідэя і адраджэнне славян. 20–90-я гады XIX стагоддзя,* „Полымя" 1993, № 4, с. 6; Турук Ф. Ф., *Указ. Соч.*, Москва 1921, с. 9.

[14] Р. Радзік, *Узаемаабумоўленасць нацыянальнага развіцця польскага і беларускага грамадства (да 1914 г.)* [у:] *Беларусіка=Albaruthenica,* Мінск 1993, Кніга 1, с. 91.

Калі яго жонка (А. Маеўская), пад уплывам сваіх варшаўскіх знаёмых папракнула яго ў не вельмі прыязнных адносінах да Польшчы і патрабавала, каб ён змяніў свой патрыятызм, дык Кіркор адказаў:

> Ты добра ведаешь, як я люблю Літву, як ненавіджу (зашыфраванае слова, магчыма Расію – ВШ). Ты хочаш, каб я змяніў патрыятызм (...) Ты ведаешь, як я цябе кахаю, але аднак, калі б у глыбіні душы я быў перакананы, што ты ўжо не ліцвінка, а толькі полька – маё каханне знікла б адразу (...) Ці Літва, для таго, каб быць з Польшчай, павінна перастаць быць Літвой? Не! Я ліцвін, – і ніколі гэта пачуццё ва мне не будзе знішчана. Я люблю сваю радзіму з усім юначым энтузіязмам, з усёй мужчынскай самаахвярнасцю. Маю сэрца і адчуваю сімпатыю да Польшчы настолькі, наскалькі яе лёс звязаны з нашым[15].

Пасля трох падзелаў Рэчы Паспалітай мерапрыемствы ўсіх расійскіх імператараў перыяда 1772–1863 гг. былі накіраваны на тое, каб „вярнуць гэтаму краю былы рускі выгляд, заслонены чужымі новаўводзінанамі і парадкамі”[16]. У палітыцы гэта знайшло сваё адлюстраванне ў **русіфікацыі**, „овеликорушении народа”, як пісаў М.Багдановіч[17]. Праграму русіфікацыі прапанаваў расійскаму ўраду магілёўскі губернатар М.М. Мураўёў. У 1831 г. ён падаў дзве запіскі, ў якіх дакладаў „аб способах сближения Белорусского края с Россией”. Яго прапановы былі разгледжаны ў Камітэце па справам заходніх губерняў 28 снежня 1831 г., які зрабіў адпаведнае заключэнне. Яно было падзелена на 3 раздзелы, кожны з якіх меў прапановы па духоўнай і грамадзянскай часцы. Прывядзем гэтыя дакументы у нашай, некалькі абагульнёнай і скарочанай форме:

---

[15] Цыт. па: І. Запруднік, *Роля гістарычнага самаўсведамлення ў працэсе фарміравання нацыянальнай свядомасці беларусаў (сярэдзіна XIX ст.)* // Беларусіка=Albaruthenica. Мінск, 1993. Кніга 2, с. 215.

[16] А. Турчинович, *Столетие Гродненской губернии: Исторический очерк. 1802–1902*// Виленский календарь на 1903 г. Вильно, 1902, с. 173.

[17] А. Багдановіч , *Беларусы* // Поўны збор твораў. Мінск, 1995. Т. 2, с. 121.

I. Прапановы, якія можна ўвесці ў дзеянне неадкладна

а) па духоўнай частцы:

1. Замяніць магілёўскага архіепіскапа і трох епіскапаў у губернiях „вернутых ад Польшчы”.

2. Палепшыць склад беларускага духавенства святарамі з Расіі, якія „образованные в России, преданные православной вере и твердого характера”. Прыняць меры да падтрымання іх становішча і стану праваслаўных цэркваў.

3. Падняць прэстыж духавенства праваслаўнага сана і адмяніць здачу вінаватых святароў у рэкруты.

4. Забараніць каталіцкаму духавенству займацца выхаваннем юнакоў у дамах і замяніць духоўныя вучылішчы на свецкія з выкладаннем у іх на рускай мове.

5.Увесці судзебную адказнасць свецкіх і духоўных асоб за «совращение православных в римско-католическую веру» па расійскаму заканадаўству.

в) па грамадзянскай частцы:

Дазволіць уступаць у грамадзянскую службу па пасведчанням дэпутацкіх сходаў, зацверджаных губернатарам. Надаць ім правы канцылярскіх служачых 3-га разраду.

II. Прапановы, якія трэба выканаць паступова і з цягам часу.

а) Па духоўнай частцы:

1. Зменьшыць колькасць рыма-каталіцкіх і грэка-уніяцкіх кляштароў, забраць іх нерухомыя маёнткі ўзамен за штогадовы грошавы аклад.

2. Усіх дзяцей праваслаўных і каталіцкіх бацькоў хрысціць у праваслаўную веру.

3. Забараніць каталіцкім святарам служыць ва ўніяцкіх кляштарах, а уніяцкім – у каталіцкіх.

4. Прыняць строгія меры, каб спыніць пераход слуг памешчыкаў у каталіцкую веру з уніятаў і праваслаўных.

в) Па грамадзянскай частцы:

1. Прызначыць на галоўныя месцы ў губерні рускіх благанадзейных чыноўнікаў (земскіх спраўнікаў, гараднічых, віцэ-губернатараў, губернатараў, пракурораў, сяброў губернскіх прысут-

ных месцаў, пошт-экспедытараў) з прадстаўленнем некаторых выгад па службе.

2. Раздаваць рускім казённыя маёнткі для ўмацавання там рускіх сямейств.

3. Аблягчэнне жыхароў Беларусі ў розных „неуравнительных тягостях".

4. Узнагародзіць знакамі адзнакі беларускіх памешчыкаў, адданых Расіі.

III. Прапановы, якія ўжо выконваюцца.

а) Па духоўнай частцы:

З Магілёўскія епархіі аддалены прэлат Шчыт.

б) Па грамадзянскай частцы:

1. Уведзена руская мова ў судзебнае і грамадскае справаводства. Польскія назвы пасад заменены рускімі.

2. Адменены Літоўскі Статут і адноўлена дзеянне расійскага заканадаўства[18].

Удакладнім сказанае.

Прыехаўшым расіянам мікалаеўскі ўрад раздаваў казённыя і канфіскаваныя ў польскай шляхты землі, каб умацаваць аграрную каланізацыю і пазбавіць эканамічнай базы будучых паўстанцаў. Улады заахвочвалі пераязджаць у Беларусь нават расійскіх дзяржаўных сялян.

На галоўныя месцы ў губерні прызначалі расійскіх благанадзейных чыноўнікаў, якія ведалі рускую (а дакладней расійскую) мову. Пры Мікалаі I яе ўвялі замест польскай не толькі як вусную, але і ў справаводства. У 1855 г. у Віленскай і Гродзенскай губернях расійскіх чыноўнікаў было каля 20%[19].

Дзеянне Літоўскага Статута 1588 было ліквідавана ў Віцебскай і Магілёўскай губернях у 1831, а ў Мінскай, Гродзенскай і Віленскай губернях – у 1840 г. Да гэтага часу І. Даніловічам быў падрых-

---

[18] *Белоруссия в эпоху феодализма: Сборник документов и материалов,* т. 4. Минск 1961, с. 107.

[19] Z. Szybeka, *Historia Białorusi 1795–2000,* Lublin: Instytut EŚW 2002, s. 44.

таваны „Заходні збор праў” для жыхароў былога ВКЛ, але Мікалай I не прыняў яго, бо Збор абапіраўся на нормы Статута. Фрагменты яго ўвайшлі ў падрыхтаваны М.М. Сперанскім „Поўны збор законаў Расійскай імперыі”[20].

У навуковай літаратуры доўга трымалася неправільнае разуменне сенацкага ўказа 18(30) ліпеня 1840 г., які, нібыта, адмяніў найменаванні „Літва”, „Беларусь” і ўвёў назву „Северо-Западный край”. На самой справе Мікалай I загадаў перапісаць указ з назвамі губерняў кожнай па асобку Віцебскай, Магілёўскай, Віленскай і Гродненскай і патрабаваў „Правила сего держаться и впредь, никогда иначе не прописывая, как поименовано, губерний”[21]. Прагледжаныя намі архіўныя матэрыялы і апублікаваныя дакументы 1830–1850-х гг. даказваюць, што назва „Северно-Западны край” не сустракаецца, а ўжываюцца „западныя губернии”, „западный край”. Але этнаграфічнасць (літоўскія, беларускія губерні) з назвы далучаных тэрыторый усё ж знікла.

Польская сістэма адукацыі змянілася расійскай. Пасля лістападаўскага паўстання ўлады зачынілі Віленскі ўніверсітэт, а ў 1841 г. Каталіцкую багаслоўскую акадэмію перавялі ў Пецярбург, у 1842 г. зачынілі Медыка-хірургічную Акадэмію. Беларуская моладзь мусіла вучыцца ў расійскіх ВНУ ( у першую чаргу ў Маскве і Пецярбурзе) і там русіфікавалася. У 1848 г. расіяне адчынілі ў Беларусі вышэйшую школу – Горы-Горацкі інстытут сельскай гаспадаркі. Польскія школы зачыняліся, а на іх месцы ствараліся расійскія пад кіраўніцтвам расійскіх чыноўнікаў. Таму зразумела, што у іх вучылі на расійскай мове (польская была забаронена ў 1836 г. у Віцебскай і Магілеўскай губернях, а пазней і ў іншых), па праграмах, падручніках і дапаможніках расійскіх. Адукацыйныя ўстановы Магілёўскай і Віцебскай губерній былі падпарадкаваны Санкт-Пецярбургскай адукацыйнай акрузе.

---

[20] *Полное собрание законов Российской империи,* Санкт-Петербург 1830.

[21] *Белоруссия в эпоху феодализма: Сб. Документов и материалов,* Т. 4.., с. 131.

У Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ёсць цікавы дакумент – прашэнне ад 29 красавіка 1833 г. да папячыцеля Беларускай навучальнай акругі Р.І. Карташэўскага вядомага расійскага дэмакрата В.Р. Бялінскага аб уладкаванні на працу настаўнікам. Да прашэння быў далучаны дадатак „Думкі мае пра тое, якім чынам трэба паступаць настаўніку пры навучанні рускай мовы вучняў, якія не могуць гаварыць на ім, і каторы са свайго боку не ведае іх айчыннай мовы". Бялінскі адзначаў, што польская і руская мовы – галіны аднаго вялікага дрэва і вывучаць іх ні паляку, ні рускаму няма цяжкасці. Ён збіраўся падабраць літаратуру перакладзеную з польскай на рускую і наадварот; выкладаць рускую граматыку на польскай мове, якой сам авалодае; займацца з дзецьмі перакладамі пасля таго, як яны пазнаюць скланенне. Бялінскі не атрымаў пасады настаўніка, бо Карташэўскі, відаць, даведаўся пра яго сувязь з Ф. Заблоцкім, які распаўсюджваў у Віцебску верш з заклікам да звяржэння царызму[22].

Сродкі ажыццяўлення русіфікацыі былі наступнымі:

– канфіскацыя, секвестр, каланізацыя захопленных зямель;
– дэпартацыя, ссылка найбольш актыўных элементаў паняволенага народа;
– сканфрантаванне сялянства са шляхтай;
– ўладкаванне агульнай сістэмы кіравання і суда;
– распаўсюджванне расійскай культуры;
– умацаванне дзяржаўнага веравызнання і царквы на далучаных землях, выцясненне або ліквідацыя іншых веравызнанняў[23].

---

[22] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, ф. 3157, воп. 1, с. 43, а. 213 аб. – 219 аб.; *Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі,* рэд. С.А. Умрэйка, Мінск 1986, с. 169.

[23] Падрабязней пра пералічаныя сродкі русіфікацыі гл.: В.В. Швед, *Паміж Польшчай і Расіяй…*; Z. Szybieka, *Historia Białorusi 1795–2000…*; С.Я. Куль-Сяльверстава, *Беларусь на мяжы стагоддзяў і культур: Фарміраванне культуры Новага часу на Беларускіх землях (другая палова XVIII ст. – 1820-я гады),* Мінск, 2000; С.В. Таляронак, *Палітыка царызму ў адносінах да каталіцкай і ўніяцкай царквы на Беларусі (1772–1839),* „Весці АН Беларусі. Серыя грамадскіх навук" 1992, № 2, с. 60–66.

Пасля паўстання 1863–64 гг. стаў узмацняцца у грамадска-палітычным жыцці **„западнорусизм” (заходнерусізм)**. Яго галоўным тэарэтыкам быў народжаны ў Беларусі прафесар гісторыі Духоўнай акадэміі ў Пецярбургу Міхаіл Каяловіч, які лічыў беларусаў часткай расійскага народу, у які ўваходзілі таксама велікарусы (расіяне) і маларусы (украінцы). Каяловіч, каб аслабіць уплывы палякаў прапаноўваў увесці ў школах і адміністрацыі беларускую мову, а землі гаспадароў-палякаў распарцэляваць сярод беларускіх сялян. Прыхільнікі заходнерусізму імкнуліся даказаць адвечную сувязь Заходняй Расіі з іншымі часткамі Расіі. Аднак пасля больш глыбокага вывучэння Беларусі і яе народа, некаторыя даследчыкі зразумелі гістарычныя, этнічныя і культурныя адметнасці беларускай зямлі і, нават, спрычыніліся да развіцця беларускай нацыянальнай свядомасці. У Беларусі падтрымоўвалі заходнерусізм чыноўнікі, настаўнікі, праваслаўнае духавенства – усе тыя, хто залежыў ад расійскага ўрада і утрымліваўся за кошт расійскай дзяржавы. У падтрымцы апошняй яны бачылі дасягненне свайго дабрабыту і тоеснасці краю[24].

З вясны 1923 г. на тэрыторыі Савецкай Беларусі праводзілася палітыка **беларусізацыі**: адбываўся ўвод беларускай мовы ў публічнае жыццё і грамадскія, дзяржаўныя ўстановы, прызначэнне на пасады ў апошніх беларусаў. Гэтаму добра спрыялі інтэнсіўныя курсы навучання беларускай мовы. У 1924–1925 гг. пачаліся курсы для настаўнікаў, чыноўнікаў дзяржаўных і партыйных органаў кіравання. У гарадах адчыняліся курсы для працоўных, арганізоўвалі гурткі беларусазнаўства сярод студэнтаў і сялянства. Ужо ў 1927 г. беларуская мова была ў 80% дзяржаўных устаноў вышэйшага ўзроўня, 80% партыйных і дзяржаўных чыноўнікаў на абласным і рэспубліканскім узроўнях валодалі беларускай моваю. У 1924–1929 гг. значна вырасла колькасць газет і часопісаў, выдава-

[24] Гл.: А. Цьвікевіч, „Западно-руссизм”... ; Z. Szybeka, *Historia Białorusi* ..., s. 121–122.

ных па-беларуску. У 1927 г. працэнт беларусаў, занімаючых пасады на ўзроўні кіраўнікоў раёнаў і абласцей вырас з 30 да 46%. Сярод глаў вясковых саветаў працэнт беларусаў дасягнуў 90%. Павысіўся працэнт беларусаў на камандуючых пасадах у войску, якое пачало фарміравацца на беларускай тэрыторыі. Быў задуманы пераход беларускай мовы з кірыліцы на лацініцу.

Напэўна, першы раз беларуская адукацыя атрымала з боку дзяржаўнай ўлады прызнанне і вырасла да справы дзяржаўнага статуса. У 1920/21 гг. у школьную праграму ўлады ўключылі прадмет „Звесткі пра Беларусь”. Новая палітыка аказала ўплыў на развіццё навукі, была апрацавана навуковая тэрміналогія. У 1922 г. у Мінску пачаў дзейнасць Інстытут беларускай культуры (з 1929 г. – Беларуская акадэмія навук). 10 снежня 1924 г. яго прэзідыўм прыняў рашэнне аб скліканні ў чэрвені 1925 навуковага з’езда беларусістаў. У 1926 г. ён быў пераутвораны ў акадэмічную канферэнцыю, якая занялася граматыкай беларускай мовы.

Беларусізацыя ўнесла значны ўнёсак у развіццё беларускай нацыянальнай самасвядомасці. Беларускі народ атрымаў у гэты час усё, што не даў яму ні польскі, ні расійскі ўрады. Але савецкая ўлада не турбавалася пра беларусаў. Беларусізацыя была „чырвонай” – трэба было быць лаяльным да цэнтральнай улады, падтрымліваць палітыку, якую яна праводзіла. Беларусізацыя праводзілася адміністрацыйнымі сродкамі і мела прымусовы і штучны характар. Таму ў некаторых мясцовасцях беларуская моладзь выступіла супраць беларускамоўнай адукацыі.

У першай палове 1990-х гг. адбылася другая беларусізацыя. 26 студзеня 1990 г. Вярхоўны Савет прагаласаваў за наданне беларускай мове статуса афіцыйнай дзяржаўнай мовы, быў прыняты „Закон аб мовах”. 20 верасня 1990 г. урад ухваліў „Дзяржаўную праграму развіцця беларускай мовы і іншых нацыянальных моў у Беларускай ССР”. 4 чэрвеня 1991 г. быў прыняты „Закон аб культуры”, а 29 кастрычніка 1991 г. – „Закон аб адукацыі”. У апошнім адзначалася, што адукацыя ажыццяўляюцца дзеля „фарміравання

і ўмацавання нацыянальнай свядомасці грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, а таксама павагі да іншых краін і народаў свету”[25].

**Палітыка саветызацыі**, па словах польскага даследчыка А. Главацкага была накіравана да прымушэння сілай сістэмных зменаў (сацыяльна-гаспадарчых, палітычна-культурных), а таксама ідэалагічнага эксперыменту, які павінен быў перабудаваць у тым ліку палякаў у савецкіх людзей. Вынікам гэтых зменаў павінна было быць нараджэнне новага чалавека, чалавека савецкага[26]. У Беларусі яна пачалася адразу пасля ўваходжання Савецкай Беларусі ў СССР (1922). У краіне стала фармавацца савецкая палітычная сістэма. На чале яе знаходзілася КП(б)Б, паколькі іншыя партыі былі ліквідаваны да сярэдзіны 1920-х гг. У 1922 г. камуністаў у Савецкай Беларусі налічвалася 4,8 тыс. чал.; у 1928 – ужо 33,3 тыс. чал. Пад кантролем партыі было ўсё – эканоміка, грамадска-палітычнае жыццё, культурнае развіццё. Па сутнасці партыйны апарат паяднаўся з дзяржаўным. Памочнікам Камуністычнай партыі быў савецкі камсамол. Былыя моладзевыя арганізацыі „Праца і свет”, яўрэйскі камсамол, „Саюз сельскай моладзі” і іншыя былі зачынены. У 1924 г. налічвалася 12,3 тыс. камсамольцаў, а перад 1941 г. – 263 тыс. Гэта яны ў першую чаргу праводзілі па закліку партыі калектывізацыю, індустрыялізацыю і культурную рэвалюцыю ў Беларусі і ў цэлым СССР. Сярод рабочых былі створаны прафесійныя саюзы. Колькасць іх чальцоў таксама павышалася з прыкладна 150 тыс. у палове 1926 г. да 650 тыс. у канцы 1940 г.

Фармальна ўладу ў БССР згодна Канстытуцый ажыццяўлялі Саветы ўсіх узроўняў – ад вясковых да Вярхоўнага Савета. Выбары былі агульныя, раўныя і прамыя. Аднак у сапраўднасці гэта былі „выбарамі без выбараў”. Каб узмацніць сувязь Саветаў з працоўнымі масамі, пры іх сталі стваралі розныя камісіі і секцыі, а менавіта: адукацыйныя, культурныя, сельска-гаспадарчыя, фінанса-

[25] З. Запруднік, *Беларусь на гістарычных скрыжаваннях*. Мінск 1996, с. 148–151.
[26] J. Szumski, *Sowietyzacja Zachodniej Białorusi...*, s. 15.

ва-падатковыя, санітарныя і г.д. У 1926 г. яны аб'ядноўвалі 20 тыс. чал., а ў 1931 – 80 тыс.[27].

Камуністычная ўлада пастаянна ваявала супраць сапраўдных і вымышленых ворагаў, праводзіла чысткі ў партыйным, літаратурным і навуковым асяродзі. Людзей абвінавачвалі ў "буржуазным нацыяналізме". Замянялі мясцовыя кадры пераважна на расіян. Русіфікацыя, пра якую мы гаварылі раней, стала ў пасляваенны час часткай дзяржаўнай ідэалогіі, а расіяне – стрыжнем „кіручага народа". У 1956 г. на міжрэспубліканскай канферэнцыі ў Ташкенце было сказана, што руская мова стала ўсім савецкім людзям „другой роднай мовай" і сродкам „узбагачэння" лексікі нацыянальных моў. Падчас візыту ў Мінску М. Хрушчоў выказаўся канкрэтна: „Чым хучэй усе мы будзем гаварыць па-руску, тым хутчэй пабудуем камунізм". У 1960-я гг. пры першым сакратары КП(б)Б П. Машэраве пачалася „эпідэмія вызвалення ад беларускай мовы". Адукацыя ад сярэдняй школы да інстытутаў і універсітэтаў была на рускай мове, а навучанне ажыццяўлялася па праграмах, напісаных у РСФСР. Беларускія школы засталіся толькі на вёсках.

У пасляваенныя гады ў БССР прыйшоў у заняпад беларускамоўны друк. У перыяд з 1960 г. па 1980 гг. колькасць кніг на беларускай мове скарацілася з 26% да 12%. Беларускія творы насельніцтва чытала ў перакладзе на рускую мову. Амерыканскі гісторык беларускага паходжання Янка Запруднік вельмі трапна падсумаваў дадзеную сітуацыю: „У дзяржаве поўнай пісьменнасці беларускі народ (як і ўсе астатнія нерасійскія народы) стаў жахліва непісьменным у сферы сваёй гісторыі і культуры"[28]. Гісторыю Беларусі вучылі па падручніках Л.С. Абэцэдарскага, які прытрымліваўся лініі аб неіснаванні беларускай дзяржаўнасці ў часы ВКЛ (паводле аўтара гэта была краіна, у якой літоўская і польская шляхта прыгнятала беларускіх сялян), існаванні старажытнарускага народу як

[27] Гл.: Я. Трацяк, *Саветы. Заходнебеларускі раман-хроніка*, Гродна 2015.
[28] Я. Запруднік..., с. 117–121

калыскі трох усходнеславянскіх – рускага, украінскага і беларускага; распаўсюджваў міты пра мары беларусаў аб жыцці ў расійскай дзяржаве; пісаў пра Айчынную вайну 1812 г.; сцвярджаў, што нараджэнне першай беларускай дзяржавы адбылося ў 1919 г. дзякуючы расійскім камуністам[29].

У выніку дзейнасці камуністычнай партыі, органаў савецкай улады, грамадскіх таварыстваў савецкай накіраванасці быў створаны так званы „савецкі народ”, „навуковую” характырыстыку якога даюць энцыклапедыі таго часу: 1) новая гістарычная, сацыяльная і нацыянальная супольнасць людзей, маючая сумесную тэрыторыю, эканамічную і сацыялістычную культуру; саюзную агульнанацыянальную дзяржаву з адзінай мэтай – будаўніцтвам камунізму; 2) шматнацыянальная супольнасць працаўнікоў горада і вёскі, злучаная агульным сацыялістычным ладам, марксісцка-ленінскай ідэалогіяй, камуністычнымі ідэаламі працоўнага класу і прынцыпамі інтэрнацыялізма. Пра савецкіх людзей пісала ў сваіх творах Святлана Аляксіевіч, першая беларуская лаўрэатка Нобелеўскай прэміі ў галіне літаратуры. У сваёй нобелеўскай лекцыі яна сказала:

> Я никогда не могу произнести слово „совок” , тогда мне пришлось бы так назвать своего отца, родных, знакомых людей. Друзей. Они все оттуда – из социализма. Среди них много идеалистов. Романтиков. Сегодня их называют по-другому – романтики рабства. Рабы утопии. Я думаю, что все они могли бы прожить другую жизнь, но прожили советскую[30].

## Высновы

Падводзячы вынікі спробы ацэнкі ўмоў фармавання беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці належыць адзначыць, што апісаныя

[29] Z. Szybeka, *Historia Białorusi ..*, 2002, s. 400–402.

[30] С. Алексиевич, *О проигранной битве*, „Народная воля” 2015, 11 снежня, с. 3.

праблемы спынялі або ўскладнялі натуральны працэс фарміравання беларускага народу. Аднак нягледзячы на цяжкасці фарміраванне беларускай нацыі адбывалася. Яна захавала сваю этнічна-культурную асаблівасць стаўшы палітычнай нацыяй, якая мае будычыню.

## Бібліяграфія


Akerman A., *Gìstoryâ Garodnì. 1919–1991.Nacyânalìzacyâ, vynìščènne ì savetyzacyâ sârèdneèŭrapejskaha mesta,* Smalensk: Inbelkult 2021 [Акерман А., *Гісторыя Гародні. 1919–1991. Нацыяналізацыя, вынішчэнне і саветызацыя сярэднеэўрапейскага места,* Смаленск: Інбелкульт 2021].

Aleksievič S., *O proigrannoj bitve*, „Narodnaâ volâ” 2015, 11 snežnâ, s. 3 [Алексиевич С., *О проигранной битве*, „Народная воля” 2015, 11 снежня, с. 3].

Bagdanovìč A., *Belarusy,* [u:] *Pойny zbor tvoraй*, Mìnsk 1995, t. 2 [Багдановіч А., *Беларусы* [у:] *Поўны збор твораў*, Мінск 1995, t. 2].

*Belorussiâ v èpohu feodalizma: Sbornik dokumentov imaterialov*, t. 4, Minsk: Izd-vo ANB 1961 [*Белоруссия в эпоху феодализма: Сборник документов и материалов,* т. 4, Минск: Изд-во АНБ 1961].

Białakozowicz B., *U źródeł kształtowania się nowożytnie białoruskiej świadomości narodowej,* „Białoruskie Zeszyty Historyczne” 1995, nr 2, s. 51–52.

C′vìkevìč A., *„Zapadno-russizm”: Narysy zgìstoryì gramadskaj myslì na Belarusì й XIX – pačatku XX st.,* 2-e vyd. Mìnsk: Navuka ì tèhnìka 1993 [Цьвікевіч А., *„Западно-руссизм”: Нарысы з гісторыі грамадскай мыслі на Беларусі ў XIX пачатку XX ст.,* 2-е выд., Мінск: Навука і тэхніка 1993].

Grabenskij V., *Istoriâ pol'skogo naroda,* SPB. 1910 [Грабенский В., *История польского народа*, СПб. 1910].

Kukieł M., *Dzieje Polski porozbiorowej 1795–1921,* wyd. 4, Paris 1984.

Kul′-Sâl′verstava S.Â., *Belarus' na mâžystagoddzâй ì kul'tur: Farmìravanne kul'tury Novaga času na Belaruskìh zemlâh (drugaâ palova XVIII st. – 1820-â gady),* Mìnsk: BDU 2000 [Куль-Сяльверстава С.Я., *Беларусь на мяжы стагоддзяў і культур: Фарміраванне культуры Новага часу на Беларускіх землях (другая палова XVIII ст. – 1820-я гады),* Мінск: БДУ 2000].

Lìs A., *Belaruskaâ ìdèâ ì adradžènne slavân. 20–90-â gady XIX stagoddzâ,* „Polymâ” 1993, nr 4 [Ліс А., *Беларуская ідэя і адраджэнне славян. 20–90-я гады XIX стагоддзя,* „Полымя” 1993, nr 4].

Lûbavskij M.K., *Osnovnye momenty istorii Belorussii*, Moskva 1918 [Любавский М.К., *Основные моменты истории Белоруссии*, Москва 1918].

Nacyânal′ny gìstaryčny arhìŭ Belarusì, f. 3157, vop. 1, s. 43, a. 213 ab. – 219 ab. [Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, ф. 3157, воп. 1, с. 43, а. 213 аб. – 219 аб.].

*Narysygìstoryì narodnaj asvety ì pedagagìčnaj dumkì ŭ Belarusì,* rèd. S.A.Umrèjka, Minsk: Narodnaâ asveta 1986 [*Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі,* рэд. С.А. Умрэйка, Мінск.: Народная асвета 1986].

Pigoń St., *Księcia kuratora Adama Czartoryskiego troski o język i literatura polska* [w:] „Źródla mocy" 1931, z. 7.

*Polnoe sobranie zakonov Rossijskoj imperii,* Sankt-Peterburg 1830. [*Полное собрание законов Российской империи*, Санкт-Петербург 1830].

Radzìk R., *Uzaemaabumoŭlenasc' nacyânal'naga razvìccâ pol'skkaga ì belaruskaga gramadstva (da 1914)* [u:] *Belarusìka=Albaruthenica*, Mìnsk: Navuka ì tèhnìka 1993, knìga 1 [Радзік Р., *Узаемаабумоўленасць нацыянальнага развіцця польсккага і беларускага грамадства (да 1914 г.)* [у:] *Беларусіка=Albaruthenica,* Мінск: Навука і тэхніка 1993, кніга 1].

Ratč V., *Pol'skaâ èmigraciâ do i vo vremâ poslednego mâteža 1831–1863 gg.*, Vìl′na 1866 [Ратч В., *Польская эмиграция до и во время последнего мятежа 1831–1863 гг.,* Вільна 1866].

Šolkovič S., *Pol'skaâ propaganda v učebnyhzavedeniâh Severo-Zapadnogo kraâ* [v:] *Sbornik statej, raz"âsnâûŝih pol'skoe delo po otnošeniû k Zapadnoj Rossii*, sost. Šolkovič, vyp. 1, Vil′na 1885. [Шолкович С., *Польская пропаганда в учебных заведениях Северо-Западного края* [в:] *Сборник статей, разъясняющих польское дело по отношению к Западной России,* сост. Шолкович, вып. 1, Вильна 1885.

Šved V.V., *Pamìž Pol'ščaj ì Rasìâj: Gramadska-palìtyčnae žyccë na zemlâh Belarusì (1772–1863),* Grodna: GrDU 2001 [Швед В.В., *Паміж Польшчай і Расіяй: Грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772–1863),* Гродна: ГрДУ 2001].

Szumski J., *Sowietyzacja Zachodniej Białorusi. 1944–1953. Propaganda i edukacja w służbie ideologii,* Kraków 2010.

Szwed W., *Przejawy licwinskosci w zyciu spoleczno-poltycznym na ziemiach Bialorusi (pierwsza polowa XIX wieku)* [w:] Rocznik centrum studiów białoruskich. 2016, № 1, S. 45–61.

Szybeka Z., *Historia Białorusi 1795–2000,* Lublin: Instytut EŚW, 2002.

Talâronak S.V., *Palìtyka caryzmu ŭ adnosìnah da katalìckaj ì ŭnìâckaj carkvy na Belarusì (1772–1839),* „Vescì AN Belarusì. Seryâ gramadskìh navuk" 1992, nr 2, s. 60–66 [Таляронак С.В., *Палітыка царызму ў адносінах*

*да каталіцкай і ўніяцкай царквы на Беларусі (1772–1839),* „Весці АН Беларусі. Серыя грамадскіх навук” 1992, № 2, с. 60–66].

Tracâk Â., *Savety. Zahodnebelaruskì raman-hronìka,* Grodna: Ûrsaprìnt 2015. [Трацяк Я., *Саветы. Заходнебеларускі раман-хроніка,* Гродна: ЮрСаПрінт 2015].

Turčinovič A., *Stoletie Grodnenskoj gubernii: Istoričeskij očerk. 1802–1902* [v:] *Vilenskij kalendar' na 1903 g.,* Vilno 1902. [Турчинович А., *Столетие Гродненской губернии: Исторический очерк. 1802–1902* [в:] *Виленский календарь на 1903 г.,* Вильно 1902].

Turuk F.F., *Belorusskoe dviženie: Očerkiistorii nacional'nogo i revolûcionnogo dviženiâ belorussov*, Moskva: Gosizdat 1921. [Турук Ф.Ф., *Белорусское движение: Очерки истории национального и революционного движения белоруссов,* Москва: Госиздат 1921].

Zaprudnìk Â., *Belarus' na gìstaryčnyh skryžavannâh*, Mìnsk: VC „Bac'kaŭščyna” 1996. [Запруднік Я., *Беларусь на гістарычных скрыжаваннях*, Мінск: ВЦ „Бацькаўшчына” 1996].

Zaprudnikì I., *Rolâ gìstaryčnaga samaŭsvedamlennâ ŭ pracèse farmìravannâ nacyânal'naj svâdomascì belarusaŭ (sârèdzìna HÌH st.)* [u:] *Belarusìka =ALBARUTHENICA*, Mìnsk: Navuka ì tèhnìka 1993, knìga 2 [Запруднік I., *Роля гістарычнага самаўсведамлення ў працэсе фарміравання нацыянальнай свядомасці беларусаў (сярэдзіна XIX ст.)* [у:] *Беларусіка =Albaruthenica*, Мінск: Навука і тэхніка 1993, Кніга 2].

## Conditions of formation of the identity of Belarusians (1795–1991): attempt to outline the problem

The author examines the main processes of social and political life, which positively or negatively influenced the formation of the identity of Belarusians in various periods of the country's history: polonization and Litvinism at the end of the 18th-first half of the 19th century,Russification after the uprising of 1830–31, Western Russianism in the middle of the 19th century, Belarusianization in 1923–27, Sovietization of Belarusian people in 1922–91. The essence of each of the mentioned processes is revealed, examples are given.

Keywords: Polonization, Litvinism, Russification, Western Russianism, Belarusianization, Sovietization